новае месца цэлымі вёскамі і вуліцамі, каб і тут жыць побач з родзічамі і сябрамі. А жыхары вёскі Белы Бераг Нараўлянскага раёна на новым месцы, у вёсцы Скрыгалаў, захавалі памяць аб сваёй вёсцы ў назве вуліцы, дзе пасяліліся.

У снежні 1992 г. арганізавана Мазырскае аддзяленне фонду інвалідаў — удзельнікаў ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС «Дапамога». У адпаведнасці са статутам фонд клапоціцца аб інвалідах-ліквідатарах, сем'ях памерлых удзельнікаў ліквідацыі аварыі. Створаныя на грамадскіх пачатках таварыствы «Дапамога», саюз «Прыпяць» праяўляюць міласэрнасць да ўсіх грамадзян, якія пацярпелі ад аварыі.

*Т. Пілінчук*

* * *

Таемна-задумны палескі мой краю,
Шчымлівая песня і казка.
З мазырскіх вышыняў цябе сузіраю,
А сэрцу пакутліва-цяжка.

Знудзілася маці-зямля пад нагамі
Ад гора-бяды невыноснай:
Праклятьі Чарнобыль мой дзень апаганіў,
І сумна, і тлумна, і слёзна.

Я трызню цнатлівымі ў росах лугамі,
Раскошаю прыпяцкіх плёсаў.
Мне б чыстымі зноўку прайсціся гаямі,
Заснуць у духмяных пракосах.

Нямее краса, ды квітнее надзея,
І ёй, быццам Богу, малюся,
А боль неадступны са мною падзеліць
На досвітку клёкатам бусел.

*Васіль Андрыеўскі*

## Духоўныя скарбы Мазыршчыны

Палеская зямля шчодра дзеліцца з людзьмі сваімі скарбамі. Але скарбы не толькі ў зямлі, — багатая Мазыршчына і сваёй культурнай спадчынай, глыбокімі фальклорнымі вытокамі. Гэтым краем захапляліся і не раз прыязджалі сюды беларускія, рускія, польскія, украінскія этнографы і фалькларысты XIX — XX стст.: П. Шпілеўскі, А. Васільева, В. Сакалоў, Ю. Кручкоўскі, А. Кольберг, П. Чубінскі, В. Тур, М. Доўнар-Запольскі, Я. Карскі, З. Даленга-Хадакоўскі, А. Сержпутоўскі, К. Машынскі, Ч. Пяткевіч, А. Крукоўскі, І. Сербаў, П. Бузук і многія іншыя.

Багаты сваімі культурнымі традыцыямі горад Мазыр, і іх тут не толькі берагуць, але і памнажаюць. У горадзе працуе краязнаўчы музей, выставачная зала, парк культуры і адпачынку «Перамога». У розных гуртках, секцыях і клубах па інтарэсах, створаных пры ўстановах культуры, займаецца звыш 2 тысяч мазыран. 11 калектываў мастацкай самадзейнасці атрымалі званне «народны» і «ўзорны». Вялікую канцэртную дзейнасць ажыццяўляюць гарадскі духавы аркестр, ансамбль народных музыкаў «Явар», калектывы мастацкай самадзейнасці Палаца культуры «Будаўнік» трэста «Мазырсельбуд», Палаца культуры нафтаперапрацоўчага завода.

У горадзе праводзіцца шмат масавых мерапрыемстваў — святы, народныя гульні, кірмашы, фестывалі мастацтваў, агляды-конкурсы калектываў мастацкай самадзейнасці. Многія святы сталі традыцыйнымі і жаданымі для мазыран: «Каляды», «Гуканне вясны», свята горада, асеннія кірмашы і інш.

Кніжны фонд цэнтральнай сістэмы бібліятэк складае 480 тыс. экземпляраў, налічвае 29 350 чытачоў. Бібліятэкі праводзяць вялікую асветніцкую работу: створаны клубы па інтарэсах, праводзяцца сустрэчы з паэтамі і пісьменнікамі, абмеркаванні кніг, тэматычныя выставы літаратуры, агляды кніжных навінак.



Хор ветэранаў Мазыра



Ансамбль «Радуніца»

У гарадской выставачнай зале традыцыйна праводзяцца выставы прафесійных і самадзейных мастакоў, персанальныя выставы членаў Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь: Пятра Захарава, Мікалая Дубровы, Валерыя Сідоркіна. Папулярнымі і традыцыйнымі сталі вечары «Жывапіс і музыка ў сям'і муз», «Калядныя вечары», на якіх гучаць музыка, вершы і песні прафесійных і самадзейных выканаўцаў.

Гэтак жа і работнікі культуры Мазырскага раёна асаблівую ўвагу ўдзяляюць зберажэнню і развіццю беларускай культурнай спадчыны, народных звычаяў і традыцый. Таму і рэпертуар калектываў мастацкай самадзейнасці — гэта найперш мясцовы фальклорны матэрыял. Амаль пры кожнай установе культуры ёсць пакоі-музеі альбо куткі народнай творчасці, сялянскага побыту. Усяго на тэрыторыі раёна ў клубных установах працуюць каля 20 фальклорных дарослых калектываў, 178 гурткоў мастацкай самадзейнасці, клубаў па інтарэсах, у якіх займаюцца больш за 1800 чалавек.

Работнікамі культуры сабрана больш за 400 народных абрадавых і пазаабрадавых песень, легендаў і паданняў пра гісторыю населеных пунктаў раёна, прыказак і прымавак і іншых твораў вусна-паэтычнай народнай творчасці. Асаблівую цікавасць заваяваў ансамбль народнай музыкі «Радуніца», які створаны пры РДК. Песні, якія выконвае гэты калектыў, запісаны ў вёсках Мазыршчыны. Два калектывы мастацкай самадзейнасці («Радуніца» — РДК і «Валошкі» — Прудкоўскі СДК) носяць ганаровае званне «народны».

*В. Палазнік, А. Шаўчэнка*

## З любоўю да роднай зямлі

Краязнаўчы музей у Мазыры заснаваны 18 чэрвеня 1948 г. У аснову яго леглі экспанаты Палескай абласной выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі ў 1949 г. Паступова павялічвалася колькасць экспанатаў і дакументаў. 7 лістапада 1949 г. Палескі абласны краязнаўчы музей быў адкрыты. Размяшчаўся ён у будынку з трох пакояў агульнай плошчай 202 кв. м. Узначальваў музей І. В. Пісарчук, вялікі аматар сваёй справы, краязнаўца і гісторык. Сярод новых дакументаў былі матэрыялы аб першых кроках і развіцці рэвалюцыйнага рабочага руху, аб стварэнні першых суполак РСДРП, падзеях першай рускай рэвалюцыі 1905—1907 гг., удзельніках грамадзянскай вайны. Стараннем супрацоўнікаў А. П. Эльмана, М. М. Васілюк і іншых удалося знайсці многа новых фотаздымкаў, вайсковае абмундзіраванне і амуніцыю партызан.

Вялікі ўклад у вывучэнне Мазыршчыны ўнёс краязнаўца А. Г. Бобр. У горадзе і сельскай мясцовасці пачалі праводзіцца раскопкі, якія дазволілі высветліць археалагічнае мінулае нашага краю. Экспедыцыі, вывучэнне архіваў, краязнаўчай літаратуры, азнаямленне з вопытам работы іншых музеяў, збор успамінаў удзельнікаў мінулых падзей — усё гэта зрабіла музей сапраўднай навуковай установай горада. Выдаваліся адозвы да насельніцтва з заклікам збіраць звесткі аб сваіх продках і паселішчах. Удалося захаваць калекцыю каштоўных музейных прадметаў — рукапісаў, кніг, фотаздымкаў, рэчаў. Не толькі мінулае, але і сённяшні дзень цікавіць супрацоўнікаў музея.

Мазырскі краязнаўчы музей размешчаны сёння ў старажытным будынку на славутай Гары Камунараў. Мае залу для выстаў, а таксама філіялы — музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва М. М. Пушкара і музей развіцця народнай адукацыі ў Мазыры, які адкрыты ў сярэдняй школе № 13. Заканчваецца рамонт будынка па вуліцы Камсамольскай, 15, дзе размесціцца музей рамёстваў і промыслаў на Палессі. Створаны таксама музеі на грамадскіх пачатках у сярэдніх школах.



Хата, пакрытая чаротам у пачатку XX ст. у в. Малы Бакавец

Гара Камунараў — гістарычнае месца, запаведнае ў Мазыры, адсюль браў пачатак горад. Экспазіцыя музея разглядваецца ў двух вялікіх раздзелах: «Гісторыя дасавецкага перыяду» і «Прырода нашага краю». Прадстаўлены ўзоры жаночых упрыгожанняў — бранзалеты са шкла і фібула (бронзавы век), амфара другой паловы XII ст., калаўрот XII – XIII стст., узоры кафляных плітак, гліняны посуд XVI – XVIII стст. Сярод экспанатаў — калекцыі мінералаў і горных парод, насякомых, чучалы птушак і звяроў, вялікі гербарый.

Экспазіцыя прыродазнаўчага аддзела распрацоўвалася і стваралася навуковым супрацоўнікам музея А. Я. Кнышчук і малодшым навуковым супрацоўнікам Н. І. Анфілатавай. Тэматыку — экспазіцыйны план дасавецкага перыяду распрацаваў навуковы супрацоўнік В. В. Шабасовіч. Мастацкае аздабленне і мантаж экспазіцыі выкананы мастаком Г. В. Говарам. У 1984 г. да дня вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў адкрыты зал для выставаў. Першая выстава была прысвечана гэтай знамянальнай падзеі. Зала — месца экспаніравання мастацкіх вырабаў народнай творчасці, сустрэч з цікавымі людзьмі. Добрай традыцыяй стала штогадовае адкрыццё гарадскіх выставаў мастакоў Мазыра.

Добра ведаюць у Мазыры мастакоў братоў Віктара і Мікалая Дуброваў, У. Сідоркіна, А. Захарава. Адкрыццё кожнай выставы — з'ява ў культурным жыцці горада. Зала — цэнтр эстэтычнага выхавання насельніцтва. Тут часта выступае ансамбль старадаўняй музыкі. Адкрыты мастацкі салон, дзе можна набыць карціну.

У 1991 г. у склад краязнаўчага музея ўвайшоў як філіял музей дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва М. М. Пушкара. Мастак-кераміст, заслужаны дзеяч мастацтва Беларусі, член Саюза мастакоў М. М. Пушкар — нястомны падарожнік і збіральнік народных скарбаў, які сабраў багатую этнаграфічную калекцыю. У невялікай хаце размясціліся і работы самога мастака — творы дробнай пластыкі, выкананыя ў тэхніцы тэракоты.

Цяпер у Мазырскім краязнаўчым музеі, які мае фондасховішча, фоталабараторыю, бібліятэку, налічваецца каля 20 тысяч адзінак захоўвання асноўных фондаў. Гэта палеанталагічныя і нумізматычныя калекцыі, зброя і даспехі воінаў розных вякоў, этнаграфічныя калекцыі, вопратка, хатнія рэчы векавой даўніны, карты, дакументы, фотаздымкі і іншыя экспанаты. Галоўны скарб музея — тысячы прозвішчаў мазыран, якія захаваны для гісторыі...

*І. Васількова*

## Ажывала пад рукамі гліна

Мікола Пушкар быў чалавек шчыры і даверлівы, таварыскі і заўсёды вясёлы...

Нарадзіўся Мікола Мікітавіч на мяжы Расіі і Украіны — паміж Белгарадам і Харкавам, а лёс закінуў яго на Палессе, у Мазыр. Бацькоў сваіх не памятаў, ведаў толькі, што бацька меў нейкае дачыненне да мастацтва — маля-



М. М. Пушкар са сваімі героямі

ваў абразы, як казалі ў народзе, быў багамазам...

Галодныя гады дзяцінства. Працоўная калонія А. Макаранкі. Расказваў Мікола, як намаляваў партрэт Максіма Горкага перад прыездам яго ў калонію. Партрэт пісьменніку спадабаўся, і ён нават папрасіў кіраўніцтва Харкаўскага мастацкага вучылішча, каб яго прынялі на вучобу,— хлопцу не ставала гадоў. Пасля вучылішча выкладаў маляванне ў школе...

Потым вайна. Цяжкая кантузія. Канцлагер. Цудам выжыў, дачакаўся светлага дня вызвалення. Жыў у Калінінградзе. Там пачынаў як кераміст. Потым пераехаў у Мазыр, уладкаваўся мастаком на завод меліярацыйных машын. Днём маляваў ці пісаў аб'явы, а вечарамі мясіў гліну і ляпіў тое, што мроілася не адну ноч...

Любіў Мікола Пушкар мазырскі рынак, кожную нядзельку заглядваў туды. Аднаго разу запаў у душу дзядок, які прадаваў з бочачкі мёд, а побач з ім і каларытная маладзіца — родам з-пад Лельчыц. Асабліва ж уразіў яго сівы, мо за сто год, дзед — вясёлы, гаваркі, дасціпны. Цэлыя вершы-паэмы чытаў пра сваю гліну, з якой вырабляў макітры і гладышы...

Гадзіну назіраў за ім Пушкар, другую. І тады ж яго асяніла: «Во мая тэма, во каго ляпіць трэба! Гэта ж не трэба нічога прыдумваць, фантазіраваць, бяры і капіруй жыццё — а прыгажэй за яго нічога не бывае!..» Пальцы, як даўно вынашанае, вылепілі таго старога, ды так удала і трапна, што на твары Пушкара міжволі засвяцілася ўсмешка. Паляшук затоена падміргваў свайму творцу, нешта хітрае і смешнае таіў у сваёй кудлатай кужэльнай барадзе, быццам пасміхаўся, што так доўга хадзіў Мікола за сваімі тэмамі і сюжэтамі, а тут за такі кароткі час адбылося неверагоднае. У ім, дзядку-палешуку, было штосьці ад палескай зямлі, ад настрою і мудрасці працавітых і нястомных людзей...

Вось тады і адчуў, зразумеў найперш Мікола Мікітавіч, што галоўным яго героем будзе Паляшук. Бо жыццё яго мае шмат адценняў і рысаў характару. Яно спакойнае і бясконцае ў сваёй прастаце і мудрасці, памяркоўнасці, яно — як цячэнне старажытнай Прыпяці, журботнае і самотнае, як тужлівы крык жорава, які пакідае родны край і павінен ляцець у невядомую далячынь, вясёлае і дасціпнае, з хітрынкай і радасцю, якое толькі і можа быць у палешука.

Мікола Пушкар вывучаў гісторыю Беларусі, чытаў паданні і казкі. Мастака ўражвалі і натхнялі літаратурныя вобразы Сымона-музыкі, Лявона і Лявоніхі, Тараса на Парнасе, Несцеркі, Бандароўны, сівога гусляра... У марах жылі, стукаліся ў сэрца вобразы вясёлыя, смешныя і няўрымслівыя. І ён ужо не мог адпрэчыць іх ад сябе — рукі прасілі гліны.

«Паляшук-лапатнік», «Каваль», «Дрывасек», «Сваты», «Паронкі» —

дзесяткі, і сотні іншых работ і вобразаў. Мікола Пушкар услаўляў у сваіх творах чалавека працы, чалавека-дабрадзея і мудраца. А колькі жанравых сцэнак-апавяданняў, насычаных дабрадушным гумарам, непадробленай праўдай жыцця, выйшла з-пад яго нястомных і пяшчотных рук! Чаго там толькі не было — і колішні побыт палешукоў, і народныя гулянні, сівыя паданні, казкі, анекдоты пра цешчу і зяця, прымакоў і выпівох — «Пасварыліся», «Дудар», «Жылі стары са старою», «Церабавец», «Да цешчы на аладкі», «Браткі-беларусы»... Немагчыма ўсіх пералічыць. Некаторыя творы апавядаюць пра цяжкае мінулае палескага краю і яго жыхароў, пра іх клопаты і надзеі. А гэтай тэме ён супрацьпастаўляе сённяшні дзень: нараджаліся вобразы «Прыпяцкі капітан», «Паляшук з транзістарам», «Савецкі волат».

У Міколы Пушкара сваё бачанне жыцця, па-свойму ён і адлюстроўваў яго ў кераміцы. Мастак ствараў вобразы, адметныя яркай своеасаблівасцю, непаўторнасцю манеры выканання, унутранай глыбінёй.

Бадай, галоўная з усіх яго прац — «Сейбіт». У сціплай паставе апусціў Сейбіт натруджаныя рукі — адна выцягнута ўздоўж цела, а другая абаперлася на сявеньку. Вочы ж скіраваны некуды ў неба і з такой надзеяй просяць: «Божа літасцівы! Я адсеяўся, аддаў раллі апошняе зярнятка і хачу восенню сабраць ураджай, каб пракарміць сям'ю. Не падвядзі, дожджык, а я ўжо не пашкадую сілаў для матухны-зямелькі!..» Вось такія словы яскрава чуеш кожны раз, калі глядзіш на Сейбіта, і шчыра верыцца, што той дожджык, якога так чакае паляшук-сейбіт, абавязкова неўзабаве пральецца на зямлю...

У клопатах старога палешука, у яго неспакоі і сумненнях, у жартах і вяселосці б'ецца сэрца нашага народа, пульсуе яго паэтычнасць і непаўторнасць, яго духоўная моц. На тую ж тэму — «Гліна спявае», «Ярыла», «Пастух», «Паляўнічы», «Рыбакі», «Мармышка», «Плацінавы ўзрост»...

Можна шмат расказваць і расказваць пра творчую дзейнасць і жыццё цудоўнага майстра і чалавека Міколы Мікітавіча Пушкара. І пра тое, як ён арганізаваў у Мазыры музей народнай творчасці; як перадаваў свае сакрэты майстэрства малодшаму пакаленню; пра добрую і спагадлівую спадарожніцу Ганну Міхайлаўну, жонку кераміста, якая шмат яму аказвала дапамогі і натхняла ў творчасці; пра тое, як аб'ездзіў сотні паляшуцкіх вёсак і за свае грошы купляў андаракі і спадніцы, ручнікі і каптуры, прасніцы і жорны, самапрадкі і кросны — усё для таго ж музея... Але пра ўсё немагчыма расказаць, ды, бадай, і не трэба. За мастака раскажуць найлепш яго творы — у іх душа і сэрца мастака.

Шмат было задумак, планаў і мараў... Не паспеў ажыццявіць, не вытрымала сэрца — напаміналі пра сябе часы, праведзеныя ў гітлераўскіх, а потым і сталінскіх канцлагерах...

Але памяць аб ім будзе жыць доўга. Бо гэта сапраўды народны мастак. Выдатны талент будзе радаваць не адно пакаленне, і не толькі ў Беларусі: творы М. М. Пушкара ёсць у Польшчы і Славакіі, Канадзе і Амерыцы, Расіі і Нямеччыне...

*А. Бароўскі*

## Музей 61-й арміі

Цэнтрам працы па ваенна-патрыятычным выхаванні вучняў у сярэдняй мазырскай школе № 4 з'яўляецца адкрыты ў 1977 г. музей 61-й арміі 1-га Беларускага фронту. У выніку доўгай і карпатлівай пошукавай работы сабраны матэрыялы і дакументы аб баявым шляху арміі і яе злучэнняў, у тым ліку 415-й і 55-й Мазырскіх, 86-й і 356-й Калінкавіцкіх, 12-й, 76-й, 77-й гвардзейскіх стралковых дывізій і іншых злучэнняў. Сабраны таксама матэрыялы аб баявым шляху 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў.

Баявы шлях 61-й арміі высветлены ад пачатку яе фарміравання ў лістападзе 1941 г. да завяршэння Берлінскай аперацыі, у якой армія прымала ўдзел. У музеі ёсць матэрыялы пра яе камандуючых — генералаў М. М. Папова і П. А. Бялова, члена ваеннага савета арміі Д. Р. Дуброўскага, начальніка палітаддзела арміі А. Г. Коцікава, камандзіраў дывізій, Герояў Савецкага Саюза, славутых воінаў. Асобна выдзелена экспазіцыя «Калінкавіцка-Мазырская аперацыя».

Музей падтрымлівае пастаянную сувязь са шматлікімі ветэранамі 61-й арміі, 2-га і 7-га гвардзейскіх кавалерыйскіх карпусоў, ветэранамі вайны, якія жывуць на Мазыршчыне і ў іншых месцах былога Савецкага Саюза. Атрымана шмат успамінаў, фотаздымкаў, дакументаў. У музеі захоўваюцца франтавыя вершы салдата П. Жанатава, лістоўкі з тэкстам песні 14-й кавалерыйскай дывізіі, кнігі. Штогод вучні ідуць у паход па месцах баёў 61-й арміі, сустракаюцца з ветэранамі. Групай «Пошук» праводзяцца гутаркі на тэмы: «Калінкавіцка-Мазырская аперацыя», «61-я армія ў Вісла-Одэрскай аперацыі», тэарэтычныя канферэнцыі і іншыя мерапрыемствы. У святочныя дні каля помніка закатаваным падпольшчыкам і партызанам у школьным двары нясуць ганаровую вахту лепшыя вучні школы.

У 1980 г. музей стаў пераможцам рэспубліканскага агляду школьных музеяў баявой славы.

*У. Чулкоў*

## Ад Кірылы Тураўскага да нашых дзён

Гэты музей адкрыты ў 1993 г., усе яго экспанаты расказваюць аб развіцці народнай адукацыі на Мазыршчыне.

Першыя матэрыялы музея былі сабраны кіраўнікамі гурткоў дзіцячай турбазы і іх выхаванцамі. Збору экспанатаў садзейнічалі многія мазыране, якія захоўвалі матэрыялы, што маюць дачыненне да гісторыі адукацыі на Мазыршчыне. Вось даведка, дзе сказана, што першыя навучальныя ўстановы на Мазыршчыне ствараліся пры праваслаўных цэрквах. Іх з'яўленне адносіцца да часоў старажытнай Тураўскай епархіі (пачатак XII ст.). Развіццё адукацыі на Палессі непасрэдна звязана з асветніцкай дзейнасцю Кірылы Тураўскага.

У XVII — XVIII стст. у Мазыры і павеце існавала некалькі каталіцкіх школ пры касцёлах і манастырах. Адкрыццё чатырохкласнай павятовай школы адносіцца да 1799 г. У 1801 г. у ёй навучаліся 64 вучні, працавалі чатыры настаўнікі. Вывучаліся граматыка рускай, польскай і лацінскай моў, арыфметыка, паэзія, гісторыя, геаграфія, рыторыка, геаметрыя, фізіка, маляванне, замежныя мовы.

Старэйшы па часе экспанат — табліца лагарыфмаў, яна адносіцца да 1882 г. Ёсць «Грамматика русского языка» (1908), «Евангелие» (1913) — падарунак Кіеўскага апякунскага савета Мазырскай гімназіі. Захоўваецца вучнёўскі сшытак (1913), «Буквар» (1914)...

Мазыране памятаюць будынак жаночай гімназіі, які не так даўно быў знесены. У 1907 г. працавала ў горадзе рамесніцкая школа.

Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны ў Мазыры было 10 агульнаадукацыйных школ, у тым ліку 6 сярэдніх, сярэдняя школа працуючай моладзі, педвучылішча, медшкола, дзіцячая музычная школа, шэраг дзіцячых садкоў. Працавала 148 настаўнікаў. Быў ажыццёўлены пераход да ўсеагульнай сямігадовай адукацыі.

У дні вайны многія работнікі асветы змагаліся з ворагам на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі — настаўніцы Г. В. Родэ, А. Г. Папрацінская, выкладчыкі педвучылішча А. С. Мураўёў, К. В. Катлінскі і іншыя.

У лютым 1944 г. беларускі ўрад прыняў рашэнне аб адкрыцці ў Мазыры настаўніцкага інстытута. Ён пачаў працаваць у красавіку, першым дырэктарам быў прафесар А. Г. Карафан. Вялі-

кую дапамогу маладой навучальнай установе аказалі працоўныя Ульянаўскай вобласці, якія перадалі ў Мазыр падручнікі, сшыткі, абутак, вопратку. У 1952 г. настаўніцкі інстытут пераўтвораны ў педінстытут.

Гэтай навучальнай установе адведзены асобы раздзел экспазіцыі.

Цяпер у Мазыры працуюць педінстытут, палітэхнікум, медыцынскае і музычнае вучылішчы, чатыры ПТВ, 15 агульнаадукацыйных школ, санаторна-лясная школа і школа працуючай моладзі.

*А. Бобр*

### Гучыць купалаўскае слова

У сярэдняй школе № 3 (школе-гімназіі) амаль 10 гадоў назад быў адкрыты музей Янкі Купалы. Вялікі ўклад у стварэнне і папаўненне музейнай экспазіцыі ўнеслі настаўнікі В. У. Грышко і Н. П. Протас. Шмат дапамагалі ў гэтым супрацоўнікі Дзяржаўнага музея Я. Купалы ў Мінску Я. Ю. Раманоўская і С. С. Майхровіч, якія перадалі школьнаму музею не толькі копіі дакументаў, але і шэраг арыгіналаў.

Сярод экспанатаў — ксеракопія газеты «Северо-Западный край», дзе ў 1905 г. быў змешчаны купалаўскі верш «Мужык», фотаздымак групы студэнтаў Пецярбургскага універсітэта, членаў літаратурнага гуртка, з якімі не раз сустракаўся Янка Купала. Зацікавіць наведвальнікаў дублікат першай кнігі паэта «Жалейка» (1908), фотаздымкі, адзін з якіх зроблены ў 1934 г. у час I Усесаюзнага з'езда пісьменнікаў.

У музеі праводзяцца пасяджэнні клуба старшакласнікаў — «Купалінка», які арганізаваны пры бібліятэчным філіяле № 1. Аднойчы госцяй клуба была В. І. Казлоўская, якую мазыране ведалі як артыстку гарадскога народнага тэатра. Вера Іванаўна прыгадала час, калі выхоўвалася ў дзіцячым доме ў Мінску, над якім бралі шэфства Янка Купала і яго жонка. Магнітафонны запіс успамінаў В. І. Казлоўскай захоўваецца ў музеі. Лічаць сваім абавязкам дапамагаць рабоце клуба старшакласнікаў і артысты драматычнага тэатра імя І. П. Мележа. У дні такіх сустрэч паказваюцца ўрыўкі са спектакляў па творах Янкі Купалы, гучаць яго вершы, ідзе гаворка аб творах беларускіх пісьменнікаў і паэтаў. Музей наведваюць вучні з іншых школ, студэнты, турысты.

*Т. Пілiпчук, У. Шарай*

### Мастацкая галерэя ў вёсцы

У маляўнічай мазырскай вёсцы Гурыны, у будынку былой школы па ініцыятыве і пры непасрэдным удзеле вялікіх аматараў і знаўцаў жывапісу і краязнаўцаў раёна А. Я. Бычкова і С. І. Касцяна ў 1976 г. была адкрыта Мазырская карцінная галерэя. У васьмі залах выстаўлены работы вядомых беларускіх і замежных, а таксама мясцовых мастакоў, скульптараў, майстроў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ёсць творы М. Савіцкага, Т. Вашчанкі, В. Волкава, Л. Рана, Я. Шмялёва, С. Вакара, А. Кашкурэвіча, А. Паслядовіч.

Асноўны раздзел экспазіцыі — рэтраспектыўная выстава пасляваеннага беларускага мастацтва 40—90-х гадоў. Пастаянна працуе раздзел заходнееўрапейскага мастацтва, у якім прадстаўлены творы сусветна вядомых мастакоў Леанарда да Вінчы, Рафаэля, Рэмбранта, Веласкеса, Рубенса і іншых. Гэта высакаякасныя і унікальныя факсімільныя рэпрадукцыі, створаныя ў Францыі. Калекцыя падаравана Надзеяй Лежэ, што нарадзілася ў Беларусі, арыгіналы гэтых твораў зберагаюцца ў скарбніцах Заходняй Еўропы, прыватных калекцыях.

У экспазіцыі цяпер каля 400 твораў сусветнага мастацтва. Музей з'яўляецца філіялам Дзяржаўнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і знаходзіцца ў творчым кантакце з супрацоўнікамі

галоўнага музея рэспублікі, ажыццяўляецца пастаянны абмен карцінамі.

З вялікім поспехам прайшлі ў галерэі выставы беларускіх майстроў, якія працавалі ў канцы XIX — пачатку XX стст. у Расіі: В. К. Бялыніцкага-Бірулі, С. Ю. Жукоўскага, амерыканска-беларускай мастачкі Н. Русак, В. Жолтак. Арганізоўваюцца тэматычныя выставы «Бытавы жанр», «Партрэт», «Пейзаж»...

Часта выстаўляюцца і знаходзяцца ў галерэі работы мазыраніна М. М. Пушкара. У музеі можна ўбачыць таксама творы мінскіх мастакоў, якія працавалі на Мазыршчыне, пісалі партрэты лепшых працаўнікоў раёна. Тут змешчаны партрэты ўдзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны І. Букіша і І. Ахраменкі, даяркі калгаса «Радзіма» С. Сузько работы В. Гомана. Ёсць партрэт работы У. Бараноўскага П. М. Лузана, актыўнага ўдзельніка партызанскага руху. Непаўторную прыгажосць мазырскага краю адлюстравалі на сваіх палотнах пейзажысты У. Бараноўскі, В. Мінейка, В. Цюрын, А. Ландарскі.

Адзін з пакояў музея з'яўляецца мемарыяльным. Тут адноўлены рабочы кабінет, сабраны матэрыялы, кнігі, рэчы вядомага вучонага-генетыка, выхадца з Мазыршчыны акадэміка АН Беларусі П. Ф. Ракіцкага.

Сюды прыязджаюць турысты з розных краін і гарадоў з адной мэтай — на сустрэчу з прыгожым. І музей дорыць ім гэтую радасць.

*Н. Краўчанка*

## Фільм здымаецца ў Мазыры

Кінастудыя «Беларусьфільм» і браціслаўская «Каліба» (Чэхаславакія) пачалі ў Мазыры здымкі фільма «Капітан Ян» па сцэнарыі Анатоля Дзялендзіка.

Чэхаславацкай кіназдымачнай групай кіруе кінарэжысёр Марцін Цяпак, а беларускай — заслужаны дзеяч мастацтваў Аляксандр Карпаў.

Гэты кінарэжысёр ужо даўно вядомы нашым кінагледачам. Ён з'яўляецца стваральнікам такіх фільмаў, як «Далёка ў гарах», «Цішыня», «Сказ аб шчасці», «Дарога ў тысячу вёрст» і інш.

Фільм «Капітан Ян» раскажа аб нацыянальным Героі Чэхаславакіі і Герої Савецкага Саюза Яне Налепку, які ў гады мінулай вайны перайшоў на бок палескіх партызан і разам з імі змагаўся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Камандзір партызанскага атрада Налепка загінуў у лістападзе 1943 г. у баі за г. Оўруч.

У галоўнай ролі Яна Налепкі здымаецца акцёр браціслаўскага тэатра Мілан Княшко.

Ролю камісара партызанскага атрада выконвае народны артыст Беларускай ССР Фёдар Шмакаў, а партызанскай сувязной Кузуркі — папулярная кінаактрыса савецкага кіно Нона Мардзюкова. У карціне здымаюцца таксама артыстка Мая Булгакава, акцёр беларускага тэатра Белахвосцік і іншыя.

Падзеі, аб якіх будзе расказвацца ў кінастужцы, адбываліся менавіта ў гэтых краях. 101-шы славацкі полк, начальнікам штаба якога быў Ян Налепка, дыслацыраваўся ў 1943 г. у Мазыры і Ельску.

*М. Кулыба*

«Камуніст Палесся», 15 сакавіка 1972 г.

### Ад рэдактара-складальніка

Назва фільма «Капітан Ян» існавала ў працэсе вытворчасці кінастужкі. На экраны ж СССР праз год выйшаў кінафільм «Заўтра будзе позна». Акрамя гэтага фільма ў Мазыры і яго ваколіцах здымаліся кінастужкі «Дзяўчынка шукае бацьку», «Паводка» («Беларусьфільм»), «Адзіноцтва» (Адэская кінастудыя) і іншыя.

## Калі спявае душа...

«Песні роднага краю» — так называецца зборнік твораў мазырскіх самадзейных кампазітараў. Адзін з іх — І. М. Казелька, былы выкладчык му-

зычнай школы, кіраўнік некалькіх харавых калектываў Дамоў культуры і прадпрыемстваў. Песні Івана Мікітавіча даўно вядомы ў Беларусі.

Яшчэ адзін самадзейны кампазітар, творы якога ўвайшлі ў гэты зборнік,— А. М. Аўсіюк, выкладчык кафедры музыкі Мазырскага педінстытута. Яго песні гучаць у выкананні студэнцкіх хораў, ансамбляў, салістаў, а таксама хору ветэранаў вайны і працы, якім шмат гадоў кіруе А. М. Аўсіюк. Складальнік зборніка — выкладчык дзіцячай музычнай школы В. Р. Сярэбранікаў. Яго песні і аркестравыя п'есы заўсёды ў рэпертуары дзіцячых самадзейных калектываў.

Многія паэты, на вершы якіх напісаны песні, таксама мазыране. Гэта выкладчыкі педінстытута Галіна Дашкевіч і Ніна Аксёнчык, супрацоўнік краязнаўчага музея Васіль Андрыеўскі, выпускніца сярэдняй школы № 2 Святлана Леў. У зборніку музычныя творы на вершы беларускіх паэтаў Пятра Глебкі, Адама Русака, Уладзіміра Верамейчыка, Генадзя Бураўкіна, расійскіх — Аляксандра Пракоф'ева, Сяргея Астравога і іншых. Для некаторых сваіх песень І. М. Казелька піша вершы сам.

Меладычнасць песень, іх зручны для выканання дыяпазон сведчаць аб высокім прафесійным майстэрстве нашых самадзейных кампазітараў.

Са зборніка «Песні роднага краю».

ПРИПЯТЬ-МАТУШКА

*Слова и музыка И. Н. Козелько*

Припять-матушка ненаглядная
В синем мареве, как в дыму,
Вечно юная и нарядная,
Сердцу дорога моему.
А вокруг луга золоченые,
Все поет и звенит, как струна.
Ароматом трав напоенные
Ветерок, пески и волна.

Припять-матушка,
Сколько бурь и гроз
У твоих берегов пронеслось,
Сколько разных дум,
Сколько горьких слез
На волну твою пролилось.

Припять-матушка, над тобой плывут
В дали дальние облака,
Далеко плывут, к светлому зовут,
К доброму зовут на века.

МОЗЫРСКАЯ ЛИРИЧЕСКАЯ

*Слова и музыка И. Н. Козелько*

Погляжу на глобус, вижу горы, реки,
Океаны, степи, все как дивный сон,
А в средине вижу,
В самом, самом центре,
Точечку родную — Мозырский район.

За селом Булавки стоит холм высокий,
А вокруг палетки, лес со всех сторон.
За рекою дали сине-голубые,
Это — край родимый, Мозырский район.

Солнце поднимает белые туманы,
Припять дарит небу розовую гладь.
Эти все картины так вошли нам в душу,
Где б мы ни бывали — будем вспоминать.

Знаем мы, что в мире много мест красивых,
Городов, сиянье золоченых крыш,
Но не променяю наш холмистый Мозырь
На туманный Лондон, даже на Париж.

**Захоўваецца гісторыя**

На падставе пастановы Савета Міністраў БССР «Аб мерах па паляпшэнні архіўнай справы ў БССР» ад 11 лістапада 1963 г. ліквідаваны гарадскія і раённыя дзяржаўныя архівы і ўтвораны філіял Дзяржаўнага архіва Гомельскай вобласці ў Мазыры. Ён абслугоўвае гарады Калінкавічы і Мазыр, Ельскі, Жыткавіцкі, Калінкавіцкі, Мазырскі, Петрыкаўскі, Лельчыцкі і Нараўлянскі раёны. У задачы філіяла ўваходзіць ажыццяўленне арганізацыйна-метадычнага кіраўніцтва і кантролю за ведамаснымі архівамі і справаводствам 370 арганізацый і ўстаноў, размешчаных у зоне абслугоўвання філіяла.

У архіве працуе 13 спецыялістаў, якія праводзяць навукова-тэхнічную экспертызу каштоўнасці дакументаў ва ўстановах, арганізацыях, захоўваюць і выкарыстоўваюць іх. У Мазырскім філіяле захоўваецца звыш 230 тысяч

спраў, у кожнай справе — 100—200 дакументаў. Вялікая ўвага была ўдзелена на працягу апошніх гадоў зняццю абмежаванняў на доступ да дакументаў. Сярод іх — спісы так званых сацыяльна чужых элементаў 20—30-х гг. гэтага стагоддзя.

За 30 гадоў работы філіяла архіва над рознымі тэмамі працавалі сотні чалавек. За апошнія гады актывізавалася работа з прадстаўнікамі школ, бібліятэк, сельскіх Саветаў, членамі камісій па стварэнні кніг «Памяць». За 1963—1992 гг. паступіла звыш 75 тысяч запытанняў грамадзян аб пацвярджэнні працоўнага стажу работы, прымусовым угоне ў Германію і г. д. Архіў наведалі за гэты час звыш 15 тысяч чалавек. Апрацавана і прынята ад арганізацый 110 тысяч спраў. Філіял Дзяржархіва неаднаразова быў прызёрам сацыялістычнага спаборніцтва сярод філіялаў Гомельскай вобласці, узнагароджваўся Ганаровымі граматамі Камітэта па архівах і справаводстве пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь.

З вялікай увагай і высокай адказнасцю да сваіх абавязкаў адносяцца паважаныя, вопытныя супрацоўнікі архіва Л. П. Патук, М. В. Біднюк, А. І. Трафімава, М. Ф. Бандарэнка і іншыя.

*Т. Вахрушава*

## Нашчадкам у спадчыну

Любоў да роднага краю — гэта ці не найперш любоў да ягонай прыроды. Таму ва ўмовах абвастрэння экалагічнай сітуацыі на Мазыршчыне клапоцяцца пра яе і ўсяляк аберагаюць. У прыватнасці, вызначаны і старанна ахоўваюцца помнікі прыроды рэспубліканскага і мясцовага значэння.

**Каменныя валы** — на паўночна-заходняй ускраіне пасёлка Крынічны. Тры вялікія валуны ледніковага паходжання: два большыя — побач і трэці меншы — воддаль. Пра іх ёсць некалькі паданняў. Вось два з іх.



Каменныя валы

Селянін Іван на Вялікдзень паехаў арацьваламі сваё поле. А гэта быў вялікі грэх. Арэ Іван і раптам чуе голас з неба: «Іван, не гнявi мяне, кінь араць, паважай нашу веру». Не паслухаў селянін Бога, як араў, так і арэ. І раптам у ясным небе загрымеў гром, бліснула маланка, а гаспадар і ягоныя валы ператварыліся ў тры вялізныя камяні. З таго часу ляжаць яны пры дарозе як напамін пра тое, што нельга ісці супраць Бога...

Па другім паданні, валы ў селяніна вельмі стаміліся, перасталі цягнуць саху. Ён пачаў сцябаць пугай знясіленых жывёлін і крычаць на іх. У гэты час па дарозе ішоў вельмі стары чалавек, увесь белы, з кіёчкам у руцэ. Убачыўшы, як Іван здзекуецца з жывёлы, пачаў яго дакараць... Але скнарнасць засціла Івану розум — нядобрымі словамі абазваў ён старога. Вечарам не дачакаліся дома гаспадара з валамі. На тым месцы, дзе Іван араў, людзі ўбачылі тры вялізныя камяні... Вось да чаго давяла скнарнасць і непавага да старога чалавека.

ЗАКАЗНІКІ

**Мазырскія кручы** – дзяржаўны ландшафтны заказнік, пл. 1140 га (ваколіцы Мазыра).

**Зялёнамошскі** – дзяржаўны заказнік па зберажэнні і ўзнаўленні фауны і флоры, пл. 22,9 тыс. га (у заходняй частцы раёна).

**Стрэльскі** – дзяржаўны ландшафтны заказнік, пл. 15 га (ваколіцы в. Стрэльск).

**Белае** – мікразаказнік у Ляшнянскім лясніцтве па зберажэнні рэдкіх відаў раслін, пл. 20 га.

**Гай карэльскай бярозы** – 32 экземпляры на плошчы каля 2 га (паўночная ўскраіна в. Слабада).

ЖУРАВІННІКІ

Махнавіцкае лясніцтва, ур. Качуры, пл. 40 га.

Раманаўскае лясніцтва, пл. 13 га.

ДУБРОВЫ

Мазырскае лясніцтва, пл. 209 га.
Слабадское лясніцтва, пл. 121 га.
Асавецкае лясніцтва, пл. 6 га.

САСНОВЫ БОР

Мазырскае лясніцтва, ур. Вялікі Бор, пл. 86,4 га.

Падрыхтаваў
*М. Капач*

## Іх подзвіг не забыты

Непазнавальна змяніўся ў пасляваенныя гады Мазыр. Мазыране ўжо даўно прывыклі да яго шматпавярховых дамоў і прамысловых карпусоў. Даўно пабудаваныя заводы і фабрыкі не толькі адноўлены пасля вайны, але і рэканструяваны.

Дружнай сям'ёй жывуць і працуюць рускія і беларусы, украінцы і азербайджанцы, казахі і літоўцы, латышы і яўрэі – прадстаўнікі 22 нацыянальнасцей былога Савецкага Саюза. Знік з сусветнай карты вялікі і магутны агульны дом, які аб'ядноўваў пад сваім дахам братнія народы. Але з памяці людзей ніколі не сцерці слаўныя імёны тых, чый бессмяротны подзвіг, самаадданая любоў да Радзімы і свайго народа далі магчымасць нам сёння жыць пад мірным небам. Памяць пра іх удзячныя нашчадкі ўвекавечылі ў назвах вуліц і плошчаў роднага горада, пра іх подзвігі нагадваюць курганы Славы, абеліскі на брацкіх магілах, мемарыяльныя дошкі і іншыя знакі памяці...

### Названы іх імёнамі

Многія вуліцы Мазыра названы імёнамі Герояў Савецкага Саюза:

**БУМАЖКОВА Ціхана Піменавіча** – удзельніка партызанскага руху на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

**КАТАЕВА Міхаіла Максімавіча** – удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**КАТЛАЎЦА Міхаіла Паўлавіча** – ураджэнца Мазырскага раёна.

**НЯЖНОВА Валянціна Сцяпанавіча** – удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**РЫЖКОВА Антона Андрэевіча** – удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

**ЦІХАНАВА Рыгора Мацвеевіча** – удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

Імёнамі ўдзельнікаў вызвалення Мазыршчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны:

**ІВАНЕНКІ Арсена Сяргеевіча** – удзельніка баёў за Мазыр у гады Вялікай Айчыннай вайны.

**НЯЛІДАВА Фёдара Гаўрылавіча** — удзельніка вызвалення Мазыра ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў;

Імёнамі кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху на Палессі ў гады Вялікай Айчыннай вайны:

**ХАРУЖАЙ Веры Захараўны,**
**ЯЗЫКОВІЧА Фёдара Міхайлавіча.**

У назвах вуліц увекавечаны імёны ўдзельнікаў Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны:

**АПАНСКАГА Іосіфа Казіміравіча,**
**ДАНІЛЕЎСКАГА Мікалая Сцяпанавіча,**
**САЕТА Гаўрылы Рыгоравіча,**
**ТРУСЕВІЧА Івана Данілавіча.**

Помняць мазыране і супрацоўнікаў міліцыі, якія загінулі ў мірныя дні ў барацьбе з бандытамі пры іх затрыманні. Дзвюм мазырскім вуліцам дадзены імёны:

**МАРЦІНОВІЧА Міхаіла Аляксандравіча,**
**ЦАРЭНКІ Аляксандра Платонавіча.**

*І. ПілІпчук*

### Узнагарода знайшла героя

У час ваеннага ліхалецця нярэдка здаралася так, што воіны, якія здзейснілі гераічныя подзвігі, не паспявалі атрымаць заслужаную ўзнагароду. Толькі праз шмат гадоў пасля вайны ўзнагароды знаходзілі герояў.

**Пасля 1960 г. уручаны жыхарам Мазыршчыны:**

**ОРДЭН ЛЕНІНА**

**ХАРАМЕЦКАМУ Іосіфу Сямёнавічу**

**ОРДЭН АЛЯКСАНДРА НЕЎСКАГА**

**ГАРШКОВУ А. П.**

**ОРДЭН ЧЫРВОНАГА СЦЯГА**

**ГВАЗДЗЮ Аркадзю Андрэевічу**
**ГАНЧАРЭНКУ Аляксандру Міхайлавічу**
**ЛЯДВІГУ Уладзіміру Міхайлавічу**

**ОРДЭН ЧЫРВОНАЙ ЗОРКІ**

**ЕРАМЕЕВУ Івану Якаўлевічу**
**МАШУРАВУ Міхаілу Васілевічу**
**РУДЗІНСКАМУ Казіміру Казіміравічу**

**ОРДЭН СЛАВЫ III СТУПЕНІ**

**БАБРУ Мацвею Дзям'янавічу**
**БАРЫНАВУ Аляксею Андрэевічу**
**ГРЫШКОВУ Яўхіму Маркавічу**
**МЕЛЬНІКАВУ Міхаілу Дарафеевічу**
**МІЦУРУ Аўгусту Мацвеевічу**
**РУДЗІНСКАМУ Івану Валяр'янавічу**
**ФІЛІСТАВУ Дзмітрыю Іванавічу**
**ЮНІЦКАМУ Міхаілу Пятровічу**

### Ішлі радыёграмы з Мінскага падполля...

Сасноўская Вера Іванаўна нарадзілася ў 1923 г. у в. Навікі Мазырскага раёна. Да 1941 г. вучылася ў тэхнікуме. Удзельніца Вялікай Айчыннай вайны. У 1943—1944 гг. на падпольнай рабоце ў Мінску. З 1946 г. жыла ў Мазыры.

...У навагоднюю ноч 1943 года праз лінію фронту ў Мінск была закінута з групай разведупраўлення Генеральнага штаба Чырвонай Арміі Вера Іванаўна Сасноўская, ураджэнка Мазыршчыны, дзе і знаходзілася доўгіх 550 дзён і начэй.

Цяжка нават уявіць сабе работу падпольнай радысткі ў перапоўненым варожымі войскамі горадзе, з развітай сістэмай падслухоўвання і кантролю за эфірам. Зверствавалі СС і СД — службы бяспекі. Былі выпадкі, што на працягу сутак месцазнаходжанне рацыі мянялася двойчы. А што значыць перанесці рацыю з цяжкімі батарэямі сілкавання ва ўмовах пастаяннага пат-



В. І. Сасноўская

руліравання вуліц і смяротнай рызыкі! Але рэдкае шанцаванне: Вера Іванаўна ў складанай сітуацыі выжыла, не ведала правалаў, вытрымала і забяспечыла работу такой неабходнай для разведчыкаў рацыі.

А як жа дзейнічаў на псіхіку чалавека акупацыйны рэжым! Што ні дзень, што ні гадзіна — трывожная нечаканасць: тут перастрэлка, там аблава, на суседняй вуліцы арышты, у парку зноў вешалі падпольшчыкаў... Не ўсякі мог бы вытрымаць гэта...

Але ў эфір ішлі сігналы: «Цэнтр! Прыміце радыёграму з Мінска...» Цяжка цяпер падлічыць перададзеныя ў эфір паведамленні. Проста не ставілася тады такой задачы. Працавала, і ўсё! Але некалькі сотняў, а то і тысяча, магчыма, набярэцца. І пасля кожнай перадачы — смяротная рызыка. Гэта ж былі звесткі аб размяшчэнні сіл праціўніка, іх руху, паводзінах і планах акупацыйных улад, становішчы ў горадзе і многае іншае. І вельмі вялікую плату далі б фашысты за тое, каб ведаць, хто пасылае такую інфармацыю...

Пасля вайны Вера Іванаўна вярнулася на радзіму — у Мазыр. Амаль 23 гады працавала загадчыцай раённага аддзела сацыяльнага забеспячэння. У першыя мірныя гады гэта была нялёгкая работа — з людзьмі, якія перанеслі вайну, сем'ямі загінуўшых, паранеными — без ног, без рук, сляпымі, тымі, хто вытрымаў страшныя мукі, застаўся без здароўя, нерваў, каму патрэбна была маральная і матэрыяльная падтрымка. Але хутка Вера Іванаўна навучылася распазнаваць людзей, а многіх ведала ўжо асабіста. Адзін вярнуўся інвалідам са шпіталя ў зямлянку (хата згарэла), другі прыпоўз з палону ледзьве жывы, а трэці ў сорак першым вярнуўся з акружэння на пары добрых коней і цяпер вялікія правы «качае»... Дапамагала ў рабоце ваенная загартоўка.

Памерла Вера Іванаўна ў 1996 годзе.

*М. Капач*

**Гераічная вёска**

...З 1924 года Мялешкавічы былі цэнтрам сельскага Савета. Спаленая ў 1920 годзе белапольскімі акупантамі, да 1925 года вёска поўнасцю адбудавалася.

...1930 год. У вёсцы арганізаваны калгас «Палескі партызан». Амаль усё сталае насельніцтва ўключылася ў калектыўную сельскагаспадарчую вытворчасць. У тыя ж 30-я гады ў вёсцы пачалі працаваць васьмігадовая школа і хата-чытальня.

...Не мінула вёску і горкая доля 1937—1940 гадоў. Восем яе жыхароў былі без падстаў арыштаваны, як «ворагі народа». Бікша Іван Аўгуставіч, Бягляк Васіль Каленікавіч, Бягляк Васіль Парфенавіч, Петрушкевіч Баляслаў Феліксавіч і Шурынаў Яўхім Платонавіч расстраляны ў Мазыры.

...Звыш 400 чалавек жыхароў Мялешкавіч у 1941 годзе сталі ў рады абаронцаў Радзімы. Мужчыны таксама пайшлі ваяваць у партызанскія злучэнні С. А. Каўпака і А. Ф. Сабурава, Мазырскую партызанскую брыгаду імя Аляксандра Неўскага. Камандзірам брыгады стаў жыхар Мялешкавіч Аляксандр Лукіч Жыльскі, камісарам — былы дырэктар Мялешкавіцкай школы Міхаіл Кузьміч Ільінкоўскі. Жыхары вёскі змагаліся як маг-

лі. Не выконвалі распараджэнняў нямецкіх улад, хаваліся ў мясцовых лясах, дапамагалі партызанам.

Праваліласся спроба фашыстаў арганізаваць з мясцовых жыхароў паліцыю. Амаль усе 13 аднасяльчан, што паступілі на службу да акупантаў восенню 1941 года, праз месяц-другі агледзеліся: некаторыя з іх наладзілі сувязь з камуністычным падполлем, другія проста зразумелі, што хаўрусы з «новымі ўладамі» да дабра не прывядуць. У першую ж ваенную зіму большая частка паліцэйскіх была расстраляна самімі акупантамі.

З вайны не вярнулася 155 чалавек — загінулі на франтах і ў партызанскіх атрадах, прапалі без вестак; расстраляна, павешана і спалена жывымі больш як 80 мірных жыхароў. Але і гэтыя лічбы яшчэ не канчатковыя: прайшлі гады, памяць людзей і архівы ўсіх не зберагалі... У 1943 годзе вёска другі раз у гэтым стагоддзі была цалкам знішчана.

...Да 1950 года на папялішчах вайны выраслі новыя дамы і вытворчыя памяшканні калгаса. Жыццё ў вёсцы аднавілася...

...1989 год. Вёска стала цэнтрам новага саўгаса «Чырвоны Сцяг» — назва ў памяць аб гістарычных падзеях у гады грамадзянскай вайны, мужнасці яе жыхароў пры абароне Радзімы. Пачалося трэцяе ў стагоддзі адраджэнне населенага пункта. Будуецца жыллё, грамадскія і вытворчыя пабудовы. У вёсцы працуюць сярэдняя школа, участковая бальніца, сельскі Дом культуры з бібліятэкай, тры магазіны, аддзяленне сувязі, лясніцтва...

Вёска Мялешкавічы — якая ўзнікла ў сярэдзіне ці канцы XV стагоддзя — частка гісторыі нашага Палесся. Працавітыя людзі паклалі пачатак гэтай вёсцы, не адзін раз яе адраджалі, за яе жыццё гінулі. І жыццё працягваецца...

*М. Галенка, М. Капач*

## Помнікі гісторыі

### ГОРАД МАЗЫР

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** аб рэвалюцыйных падзеях і расстрэле дэманстрацыі рабочых у Мазыры ў 1905 г. (вул. Ленінская, 5).

**ПОМНІК НА БРАЦКІХ МОГІЛКАХ** змагароў за Савецкую ўладу, якія загінулі ў 1918 — 1920 гг. (вул. Фрунзе, каля стадыёна).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме № 32, дзе 5.3.1920 г. у баі з белапалякамі загінуў камісар брыгады 41-й дывізіі, дзяржаўны і ваенны дзеяч Украіны М. С. Данілеўскі (вул. Ленінская).

**МЕМАРЫЯЛЬНЫ ЗНАК** на месцы дома, у якім у 1917—1920 гг. праходзілі з'езды рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў Мазырскага павета (вул. Ленінская).

**АБЕЛІСК НА БРАЦКАЙ МАГІЛЕ** падпольшчыкаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Крупскай, на тэрыторыі сярэдняй школы № 4).

**КУРГАН СЛАВЫ, БРАЦКІЯ МОГІЛКІ** савецкіх воінаў і партызан, якія загінулі ў 1943—1944 гг. (вул. Рыжкова).

**ПОМНІК ХАРУЖАЙ ВЕРЫ ЗАХАРАЎНЕ** — землячцы, дзеячу рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, арганізатару і кіраўніку камуністычнага падполля ў Віцебску ў Вялікую Айчынную вайну, публіцысту, Герою Савецкага Саюза (вул. Ленінская).

**ПОМНІК У ГОНАР САВЕЦКІХ ЛЁТЧЫКАЎ,** якія ўдзельнічалі ў Мазырска-Калінкавіцкай аперацыі (вул. Інтэрнацыянальная).

**ПОМНІК 100 РАБОТНІКАМ** дрэваапрацоўчага камбіната, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. 8 Сакавіка).

**ПОМНІК 7 РАБОЧЫМ** металаапрацоўчай арцелі «Молат», якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну (вул. Ленінская).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме, дзе быў палявы шпіталь, у якім лячыліся ў 1944—1945 гг. параненыя воіны (вул. Фрунзе, 1).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** на доме, дзе быў прызыўны пункт ваеннага камісарыята ў 1941 г. (вул. Пралетарская, 98).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар воінаў 111-га палка 55-й стралковай дывізіі 61-й арміі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (вул. Гогаля, 100).

**МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ДОШКА** ў гонар воінаў лыжнага батальёна і вучэбнага атрада 55-й стралковай дывізіі Беларускага фронту, якія ў студзені 1944 г. удзельнічалі ў вызваленні